БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 347.965(476)(091)(043.3)

**ГУР’ЕВА**
**Алена Аляксандраўна**

# ГІСТОРЫЯ ІНСТЫТУТА АДВАКАТУРЫ БЕЛАРУСІ (XVI–XVIII стст.)

Аўтарэферат дысертацыі на суісканне вучонай ступені
кандыдата юрыдычных навук

па спецыяльнасці 12.00.01 –
тэорыя і гісторыя права і дзяржавы;
гісторыя вучэнняў аб праве і дзяржаве

Мінск, 2016

Навуковая работа выканана ў Беларускім дзяржаўнаым універсітэце.

Навуковы кіраўнік: **Доўнар Таісія Іваноўна,**
доктар юрыдычных навук, прафесар, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Афіцыйныя апаненты: **Вішнеўскі Аляксей Фёдаравіч,**
доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ўстановы адукацыі «Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь»

**Каляда Віталь Вікенцьевіч,**
кандыдат юрыдычных навук,
адваката Мінскай гарадской калегіі адвакатаў

Апаніруючая арганізацыя: **Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**

Абарона адбудзецца 14 лютага 2017 г. у 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.01 Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па адрасе: 220030 г. Мінск, вул. Ленінградская, 8, аўдыторыя 407, тэлефон вучонага сакратара: (+375 17) 226-55-41.

З дысертацыяй магчыма азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «_____» снежня 2016 года

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый У.М. Сатолін

# УВОДЗІНЫ

Актуальнасць абранай намі тэмы дысертацыйнага даследавання абумоўлена важнасцю інстытута адвакатуры на сучасным этапе пабудовы прававой дзяржавы і фарміравання грамадзянскай супольнасці. Значэнне тэмы ўзрасло і ў сувязі са здзяйсненнем рэформы інстытута адвакатуры. Так, 6 красавіка 2012 года за нумарам 334–3 уступіў у сілу новы Закон Рэспублікі Беларусь "Аб адвакатуры і адвакацкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь", які ўнёс шэраг змяненняў і новаўвядзенняў у гэтую сферу, паклаўшы пачатак новаму гістарычнаму этапу ў развіцці адвакатуры Беларусі.

Адвакатура ў тым выглядзе, у якім існуе ў наш час, мае мноства станоўчых уласцівасцей, у тым ліку тых, якія з'яўляюцца яе неад'емнай часткай, што дазваляе гаварыць пра яе як аб самастойным інстытуце, які ўвасабляе закон і абарону правоў і свабод чалавека. Аднак такое прызнанне грамадствам ролі адвакатуры стала магчымым у выніку папярэдняга і даволі складанага гісторыка-прававога працэсу. У сувязі з гэтым надзвычайная важнасць адвакатуры патрабуе разумення і ўліку дыялектыкі мінулага – будучыні гэтага інстытута. Як гістарычная каштоўнасць адвакатура з'яўляецца сістэмаўтваральным элементам сучаснай грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы. Таму даследаванне гістарычнага развіцця інстытута адвакатуры на Беларусі, як складніка агульнай айчыннай дзяржаўна-прававой гісторыі, дазваляе не толькі запоўніць пэўныя прабелы ў яго эвалюцыі, але і на гэтай аснове спрыяць дасягненню асноўнай мэты – актуалізацыі гісторыка-прававога вопыту адвакатуры з мэтай рашэння сучасных надзённых праблем.

У практычным аспекце актуальнасць даследавання выклікана неабходнасцю фарміравання гісторыка-тэарэтычнай базы для ўдасканалення звестак аб зараджэнні, развіцці і дзейнасці інстытуту адвакатуры на Беларусі і выяўлення гістарычных умоў палітыка-эканамічных і сацыяльных аспектаў уплыву дзяржавы на развіццё прававых норм, рэгулюючых дзейнасць адвакатаў.

У тэарэтычным аспекце таксама важна паказаць аб'ектыўную карціну гісторыка-прававога мінулага, прааналізаваць этапы развіцця інстытуту адвакатуры і выявіць тэндэнцыі ў нарматыўнай рэгламентацыі правапрымяняльнай адвакацкай дзейнасці ў XVI–XVIII стст. перыяду Вялікага Княства Літоўска і Рэчы Паспалітай.

Нягледзячы на значнасць і актуальнасць праблемы ўзнікнення і развіцця інстытуту адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст., гэтае пытанне не падвяргалася спецыяльнаму комплекснаму гісторыка-прававому даследаванню, таму можна канстатаваць, што нацыянальны досвед развіцця адвакатуры

перыяду XVI–XVIII стст. у дастатковай ступені не вывучаны і не ацэнены. Менавіта названыя абставіны перадвызначаюць выбар тэмы і асноўнай мэты дысертацыйнага даследавання – запаўненне прабелаў у гісторыка-прававой навуцы Рэспублікі Беларусь, якія датычаць гісторыі ўзнікнення і развіцця інстытуту адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст., што стварае падставы для далейшага развіцця пазначанай праблематыкі і мае важнае значэнне для ўдасканалення сучаснай адвакатуры.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Дысертацыйнае даследаванне непасрэдна звязана з п. 11.4 Пераліка прыярытэтных накірункаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гады, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.04.2010 г. № 585 і праводзілася ў межах асноўнай накукова-даследчай тэмы на 2010-2015 гг. кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта "Тэарэтыка-метадалагічныя і канстытуцыйныя асновы развіцця сістэмы права Рэспублікі Беларусь".

**Мэты і задачы даследавання**

Мэта даследавання заключаецца ў раскрыцці асноўных тэарэтыка-прававых пытанняў станаўлення і развіцця адвакатуры на Беларусі XVI–XVIII стст., выяўленні яе характэрных рысаў, тэндэнцый і заканамернасцей, тым самым – ліквідацыі прабелаў у гісторыка-прававой навуцы адносна функцыянавання адвакатуры XVI–XVIII стст. і распрацоўцы навукова абгрунтаваных прапаноў па ўдасканаленню адвакатуры Рэспублікі Беларусь.

У адпаведнасці з мэтай даследавання пастаўлены наступныя задачы:

- прааналізаваць прычыны і ўмовы гістарычнага з'яўлення судовай абарончай дзейнасці ў кантэксце яе сутнасці і асаблівасцей тэрміналагічнага вызначэння;
- выявіць прычыны, гістарычныя і арганізацыйна-прававыя ўмовы станаўлення інстытуту адвакатуры на Беларусі;
- паказаць спецыфіку фарміравання інстытуту адвакатуры ў XVI ст. у кантэксце тэрміналагічнага вызначэння асоб, якія займаліся судова-абарончай дзейнасцю;
- вызначыць прававы статус прадстаўніка (як наёмнага, так і прафесійнага) і правазаступніка;

- выявіць асаблівасці і тэндэнцыі ў нарматыўнай рэгламентацыі інстытута адвакатуры і правапрымяняльнай дзейнасці ў XVI–XVIII стст. перыяду Вялікага Княста Літоўскага і Рэчы Паспалітай;

- на падставе прынцыпу гістарычнай пераемнасці паказаць неабходнасць успрымання асноўных прынцыпаў і метадаў адвакацкай дзейнасці XVI–XVIII стст. на наступных гістарычных этапах з мэтай ўдасканалення сучаснай адвакатуры.

*Аб'ект даследавання* – грамадскія адносіны ў сферы станаўлення і дзейнасці адвакатуры Беларусі XVI–XVIII стст.

*Прадмет даследавання* – гісторыя развіцця адвакатуры на Беларусі як прафесійнай супольнасці ў яе неад'емнай сувязі з іншымі сацыяльнымі з'явамі: правам, эканомікай, дзяржавай, ад зараджэння першых форм юрыдычнай дапамогі да фарміравання адзінага незалежнага прафесійнага праваабарончага інстытуту.

**Навуковая навізна**

Навуковая навізна атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускай гісторыка-прававой навуцы праведзена комплекснае даследаванне праблемы зараджэння і дзейнасці інстытута адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст., у выніку якога:

- ліквідаваны істотны прабел у гісторыі дзяржавы і права Беларусі адносна пытанняў зараджэння і дзейнасці інстытута адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст.;

- на аснове аналізу дакументальна-прававога і архіўнага матэрыялу перыяду XVI–XVIII стст. і новых дасягненняў гісторыка-прававой навукі прааналізаваны прычыны і ўмовы гістарычнага з'яўлення судовай абарончай дзейнасці ў кантэксце яе сутнасці і асаблівасцей тэрміналагічнага вызначэння;

- выяўлены прычыны, гістарычныя і арганізацыйна-прававыя ўмовы станаўлення інстытута адвакатуры на Беларусі;

- паказана спецыфіка фарміравання інстытута адвакатуры ў XVI ст. у кантэксце тэрміналагічнага вызначэння асоб, якія займаліся судова-абарончай дзейнасцю;

- выяўлены асаблівасці і тэндэнцыі ў нарматыўнай рэгламентацыі інстытута адвакатуры і правапрымяняльнай дзейнасці ў XVI–XVIII стст. перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;

- палажэнні і вывады дысертацыі ствараюць навуковыя падставы для актывізацыі навуковых даследаванняў, далейшай распрацоўкі тэарэтыка-прававых пытанняў адносна прынцыпаў і метадаў адвакацкай дзейнасці, з улікам гістарычнай пераемнасці прапанавана выкарыстанне станоўчых

палажэнняў і нормаў аб адвакацкай дзейнасці ў сучаснай праватворчай праватворчасці;

- уведзены ў навуковы абарот комплекс неапублікаваных раней архіўных матэрыялаў, якія характарызуюць адвакатуру Беларусі ў статутны перыяд яе гісторыі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. На падставе аналізу дзейнасці судовага абаронцы і ў адпаведнасці з тагачаснай тэрміналагічнай разнастайнасцю яго пазначэння прапаноўваецца аўтарская пазіцыя адносна гістарычнай эвалюцыі паняцця “адвакат” з выяўленнем яго гісторыка-тэрміналагічных асаблівасцяў: пракуратар; умацаваны; пленіпантэнт; патрон (паўнамоцны прадстаўнік); паверанa (mecenas) ; палестрант; прысяжны страпчы, паверaны; адвакат.

2. Перадумовай узнікнення інстытуту адвакатуры была аб’ектыўная неабходнасць абароны ў грамадскіх спрэчках, а потым і ў судзе, інтарэсаў асоб, якія не валодалі неабходнымі пазнаннямі ў галіне юрыспрудэнцыі, а таксама, не мелі магчымасці, з якой-небудзь прычыны, самастойна прамаўляць на судзе. Разам з гэтым устаноўлена, што ўзнікненню і развіццю адвакатуры папярэднічалі яе асобныя формы: а) прадстаўніцтва: натуральнае прадстаўніцтва, прафесійнае (наёмнае) прадстаўніцтва; б) правазаступніцтва.

3. Адвакаты, як асобы, якія былі дасведчанымі ў праве і таму маглі ў пэўнай ступені абараняць перад дзяржаўнымі органамі і судом маючыя месца на той час правы свабоднага насельніцтва, існавалі на Беларусі да ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага.

4. На падставе аналізу дакументальна-прававога матэрыялу ўстаноўлена, што працэс фарміравання інстытуту адвакатуры на беларускіх землях актывізаваўся ў другой палове XVI ст., аб чым сведчаць перш за ўсё Статуты 1529, 1566, 1588 гг., аднак ён не быў завершаны і прадоўжыўся ў XVII–XVIII стст. у складзе Рэчы Паспалітай, прычым з улікам значнага ўплыву польскіх адвакацкіх традыцый і новых агульнаеўрапейскіх прававых тэндэнцый:

а) асацыяцыі адвакатаў, якія былі ўтвораны ў ВКЛ і заканадаўча замацаваны яшчэ ў XVI ст., не мелі адзінага вызначэння, павольна трансфарміраваліся ў больш развітую, у параўнанні з папярэднім перыядам, прафесійную супольнасць, у пэўнай ступені запазычаную з польскага права, пад назвай Палестра;

б) у XVII–XVIII стст. праявілася пэўная тэндэнцыя да элітарызацыі як непасрэдна Палестры, так і адвакацкай працы ўвогуле, што ў сваю чаргу прывяло да ўзнікнення інтарэсу з боку найбольш здатных і таленавітых асоб;

в) нягледзячы на тое, што судовая сістэма ВКЛ, а таксама судовы працэс і ўзаемаадносіны ўдзельнікаў у ім, былі значна набліжаны да польскіх, усё ж заставалася ў кантэксце адасобленасці ВКЛ тэндэнцыя да захавання ўласных прававых і карпаратыўных ліцьвінскіх традыцый, у тым ліку і ў сферы адвакатуры;

г) характэрнай рысай адвакатуры ў XVII–XVIII стст. стала радыкальнае пераўтварэнне вобраза і статуса адваката. Як сведчыць дакументальна-прававы матэрыял, перш за ўсё, значна ўзрос агульнаадукацыйны і прафесійны ўзровень адвакатаў у параўнанні з папярэднім перыядам. Таксама юрысты яшчэ з XVI ст. пачалі актыўна атрымліваць вышэйшую адукацыю, ае ўзровень і тыя прадметы, якім вывучаліся, былі недастатковымі ў галіне юрыспрудэнцыі, таму каштоўнасць набылі веды, атрыманыя ад непасрэднага ўдзелу ў судовых пасяджэннях і ад зносін з прафесійнымі адвакатамі-практыкамі, а таксама з мемуараў і запісаў юрыстаў.

5. Тэрытарыяльна-геаграфічнае паходжанне адвакатаў ахоплівала амаль усю тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. Аднак большасць юрыстаў паходзіла з тых паветаў ВКЛ, дзе размяшчаўся сам суд і гэта ў асноўным былі беларускія землі. Толькі нязначная колькасць адвакатаў у судах ВКЛ была выхадцамі з Польшчы. Устаноўлена, што адвакаты ВКЛ паспяхова канкурыравалі з польскімі адвакатамі, не пускаючы апошніх на рынак юрыдычных паслуг.

6. На падставе выяўленых тэндэнцый і заканамернасцей станаўлення і развіцця адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст. устаноўлена гістарычная абумоўленасць сутнасці сучаснай айчыннай адвакатуры і пераемнасці асноўных прынцыпаў адвакацкай дзейнасці, закладзеных з улікам дзяржаўна-прававой традыцыі беларускага народа яшчэ ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. У гэтай сувязі ўяўляецца, што асэнсаванне гістарычнага вопыту станаўлення і развіцця інстытуту адвакатуры, як самастойнага прававога інстытуту, у XVI–XVIII ст. на беларускіх землях будзе вельмі карысным у працэсе далейшага ўдасканалення нацыянальнай прававой сістэмы. Так, з аналізу нормаў Статутаў і архіўных дакументаў, якія ўпершыню на заканадаўчым узроўні прадугледжвалі не толькі правы і абавязкі, але і адказнасць адвакатаў за недобрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў у выглядзе турэмнага зняволення на чатыры тыдні, а таксама выплаты боку за недобрасумленную працу матэрыяльнай шкоды, аўтарам прапаноўваецца пераняць, з улікам сучасных тэндэнцый і патрабаванняў, матэрыяльную меру адказнасці адвакатаў і замацаваць яе на заканадаўчым узроўні.

Таксама адпаведна таму, што ўжо ў другой палове XVIII ст. было ўведзена правіла, згодна з якім праз пэўны прамежак часу суддзі павінны былі

даваць ацэнку дзейнасці адвакатаў, якія запісваліся ў спецыяльныя кнігі, і, якія, у наступным, мелі важкае значэнне пры вырашэнні пытання аб прафесійнай прыдатнасці адваката, на наш погяд, прадстаўляецца мэтазгодным пераняць, з улікам сучасных падыходаў, вышэйазначаную практыку. Уяўляецца, што азначаная вышэй практыка можа паспрыяць павышэнню прававых ведаў адвакатаў і якасці падрыхтоўкі апошніх да судовых працэсаў, а таксама прымяняцца для ацэнкі дзейнасці адвакатаў (якасці іх тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі), якая ў наступным можа стаць вызначальнай пры іх пераатэстацыі.

**Асабісты ўклад суіскальніка навуковай ступені**

На падставе вывучэння і аналізу шырокай базы дакументальных, архіўных матэрыялаў, а таксама выдадзеных першакрыніцаў і навуковай літаратуры аўтарам самастойна выканана прадстаўленае дысертацыйнае даследаванне. Палажэнні, абагульненні і высновы, якія выносяцца на абарону, належаць дысертанту асабіста.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Вывады дысертацыйнага даследавання прадстаўлены аўтарам у дакладах і выступленнях на 14 рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях: штогадовых канферэнцыях студэнтаў і аспірантаў БДУ (Мінск, 2005, 2009 – 2012 гг.), «Актуальные проблемы правоведения: история и современность» (Мінск, 2005), «Развитие институтов гражданского права в законодательстве Беларуси от Статута ВКЛ 1529 г. до Гражданского кодекса Республики Беларусь 1998 г.» (Мінск, 2009 г.), «Декларация о государственном суверенитете Белорусской ССР от 27 июля 1990 г. и её место в развитии конституционного процесса в Республике Беларусь» (Мінск, 2010 г.); «Конституции Республики Казахстан – 15 лет» (Мінск, 2010 г.), «Правовое обеспечение инновационного развития общества и государства» (Мінск, 2010 г.), «Дев’яті осінні юридичні читання» (Хмяльніцкі, 2010 г.), «Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі» (Мінск, 2011 г.), «Актуальные проблемы прав человека, государства и правовой системы» (Львоў, 2011 г.), «Концептуальные основы развития национальных правовых систем в контексте процессов глобализации и региональной интеграции: постсоветский опыт и перспективы устойчивого развития» (Мінск, 2011 г.), «Судебная власть на Беларуси: история, современность, перспективы развития (к 430-летию образования главного суда ВКЛ – Литовского Трибунала)» (Мінск, 2011 г.), «Юридическая наука и правоприменительная практика» (Мінск, 2012 г.), «Статут Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1566 г.: да 450-годдзя выдання» (Мінск, 2016 г.).

Атрыманыя навуковыя вынікі ўведзены ў практычную дзейнасць, што пацвярджаецца актам аб практычным выкарыстаніі, даведкай і лістом аб магчымым практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі і палажэнні дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 18 навуковых публікацыях (3,92 аўтарскіх аркуша), з іх 5 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дэсертацыйных даследаванняў (2,24 аўтарскіх аркуша), 13 публікацый з'яўляюцца матэрыяламі і тэзісамі выступленняў на навуковых канферэнцыях (1,68 аўтарскіх аркуша).

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца са спісу ўмоўных абазначэнняў, уводзін, агульнай характарыстыкі работы, пяці глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу з 345 крыніц (уключаючы 18 публікацый дысертанта), дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 152 старонкі, з іх 115 старонак – асноўны тэкст, 31 старанка – бібліяграфічны спіс, 6 старонак – дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першай главе** "Гістарыяграфія праблемы, крыніцы і метады даследавання" робіцца аналіз навуковай літаратуры па тэме даследавання і апісваецца метадалогія і метады навуковага даследаваненя. Адзначана, што пытанні гісторыі ўзнікнення і развіцця інстытута адвакатуры Беларусь XVI–XVIII стст. падвяргаліся некаторым даследаванням айчынных і расійскіх навукоўцаў дарэвалюцыйнага, савецкага і сучаснага перыядаў, а таксама закраналіся ў працах замежных даследчыкаў (польскіх, літоўскіх, украінскіх і інш.). Агляд літаратуры дазваляе зрабіць вывад аб тым, што ў працах дарэвалюцыйных вучоных (К. Малышаў, Я.У. Васькоўскі, М.К. Любаўскі, І.І. Лапо, У.У. Тараноўскі, І.Я. Файніцкі, Д.Н. Барадзін, І.У. Гессэн і інш.). ішла размома ўвогуле пра гістарычнае зараджэнне асобных форм інстытуту адвакатуры. На пачатку савецкага перыяду пытанні гісторыі развіцця адвакатуры на Беларусі амаль не закраналіся. Выключэннем з'яўляюцца працы вучоных перыяду беларусізацыі, сярод якіх неабходна адзначыць даследаванне М.В. Доўнар-Запольскага. З канца XX ст. у сувязі з абвяшчэннем дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі навуковыя распрацоўкі актывізаваліся, аднак у сваіх працах гісторыкі-правазнаўцы (І.А. Юхо, А.Ф. Вішнеўскі, Т.І. Доўнар, С.Ф. Сокал, В.А. Шаўкапляс і інш.), як правіла, даюць толькі кароткі агляд дзейнасці пракуратараў у Вялікім Княстве Літоўскім. Робіцца агульны вывад, што нягледзячы на значную колькасць публікацый, дакументальна-прававога

матэрыялу і архіўных дадзеных, праблема ўзнікнення і развіцця інстытуту адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст. комплекснаму вывучэнню не падвяргалася, што сведчыць аб наяўнасці ў гісторыка-прававой навуцы Беларусь істотнага прабелу.

**Другая глава** “Прычыны і ўмовы гісторыі з’яўлення адвакатуры” прысвечана аналізу спосабаў і формаў аказання юрыдычнай дапамогі ў некаторых першабытных народаў, у Старажытнай Грэцыі, адвакатуры Старажытнага Рыма, асноўных гістарычных асаблівасцяў фарміравання і развіцці адвакатуры ў Заходняй Еўропе. Адзначана, што на шляху да прагрэсіўнай юрыспрудэнцыі ў сферы аказання прафесійнай юрыдычнай дапамогі чалавецтва прайшло шматвяковы шлях набыцця вопыту, ведаў і практычных прававых набыткаў да тых пастаянна зменлівых умоў, у якіх паступова развіваўся інстытут адвакатуры. Пры гэтым, часам росквіту і паўнапраўнага прызнання стала толькі XX стагоддзе, калі адвакатура дамаглася незалежнасці і салідарнасці, набыла сілу, якая і ў цяперашні час актыўна выкарыстоўваецца ва ўсім свеце для забеспячэння дэмакратычных правоў і свабод чалавека.

**Трэцяя глава** “Узнікненне адвакатуры на Беларусі і станаўленне яе тэрміналагічнага вызначэння” прысвечана даследаванню асобных форм адвакатуры, якія праяўляліся ў выглядзе прадстаўніцтва і правазаступніцтва, і вядомы яшчэ са старажытных часоў. Разглядаюцца такія формы абаронча-прадстаўніцкай судовай дзейнасці ў разглядаемы перыяд, як натуральнае прадстаўніцтва, наёмнае прадстаўніцтва, правазаступніцтва. Прыведзены кропкі гледжання розных навукоўцаў наконт перыяду з’яўлення азначаных форм адвакацкай дзейнасці. Падрабязна прааналізаваны сацыяльна-эканамічныя і палітычныя прычыны іх узнікнення. Разгледжана адрозненне паміж наёмнымі прадстаўнікамі і правазаступнікамі. Адзначана, што спачатку належнага арганізацыйнага і заканадаўчага афармлення адвакатуры зроблена не было. Гэта адбылося ўжо ў перыяд прыняцця Статутаў ВКЛ (1529, 1566, 1588 гг.), пры распрацоўцы якіх улічваўся папярэдні прававы досвед, а таксама нормы звычаёвага права і судова-адміністрацыйная практыка. У главе таксама даецца аўтарскі аналіз паходжання паняцця “адвакат” адпаведна гісторыка-тэрміналагічных асаблівасцяў: пракуратар; умацаваны; пленіпантэнт; патрон (паўнамоцны прадстаўнік); паверaны (mecenas); палестрант; прысяжны страпчы, паверaны; адвакат.

**Чацвёртая глава** “Нарматыўная рэгламентацыя адвакацкай дзейнасці ў Статутах Вялікага Княства Літоўскага XVI ст.” прысвечана аналізу развіцця норм аб адвакатуры ў перыяд прыняцця Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг., прычын і ўмоваў станаўлення гэтага інстытуту. Абгрунтоўваецца, што

Статутамі ВКЛ упершыню на заканадаўчым узроўні былі прадугледжаны як правы і абавязкі, так і адказнасць адвакатаў за недобрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў. Аналізуецца з'ява павольнай трансфармацыі нормаў права ў сферы адвакацкай дзейнасці ў перыяд паміж прыняццем Першага і Другога Статутаў ВКЛ, якая выявілася ва ўзаемадзеянні Магдэбургскага права са звычаёвым і пісаным агульнадзяржаўным заканадаўствам і выпрацоўкай агульных правілаў і падыходаў. Да прыняцця Статута ВКЛ 1566 г. заканадаўчая распрацоўка асноўных і найбольш важных палажэнняў аб дзейнасці пракуратараў, у тым ліку замацоўваючых іх арганізацыйнае афармленне як прафесійнай супольнасці, была практычна завершана, што прывяло да ўвасаблення ў Статуце 1566 г. адзінага адносна стройнага прававога інстытута, які рэгуляваў дзейнасць адвакатаў. Падабенства асноўных нарматыўных палажэнняў і часам іх дубліраванне адносна дзейнасці пракуратараў у Статутах 1566 і 1588 гадоў сведчаць аб тым, што інстытут прафесійнай адвакатуры на працягу гэтага перыяду ўжо стала існаваў і быў досыць звыклай з'явай. Больш дакладная рэгламентацыя адвакацкай дзейнасці і ўнясенне новых палажэнняў у Статут 1588 г. былі выкліканы патрабаваннямі практыкі. Увогуле нормы Статута 1588 г. былі такога высокага ўзроўня, што яны дзейнічалі да XIX ст. і выкарыстоўваліся заканадаўствам наступных стагоддзяў.

**Пятая глава** "Адвакатура перыяду Рэчы Паспалітай" асвятляе пытанні дзейнасці адвакатуры на прыканцы XVI–XVIII стст. Нягледзячы на ўсё больш значны польскі ўплыў, ВКЛ імкнулася захаваць сваю самастойнасць, у тым ліку ў сферы права, і дзейнічаць на падставе ўласных прававых набыткаў. Гэта стала традыцыяй, хоць часам за ўзор шэрагу прававых інстытутаў браліся польскія і заходнееўрапейскія прававыя набыткі. Праца адвакатаў у разглядаемы час характарызавалася сваёй універсальнасцю, паколькі прадстаўнікам гэтай прафесіі даводзілася не толькі ўдзельнічаць у судовых пасяджэннях, але і даваць юрыдычныя кансультацыі, падрыхтоўваць судовыя і іншыя дакументы, суправаджаць здзелкі, ажыццяўляць разнастайныя арганізацыйныя мерапрыемствы і да т.п. Актывізацыя дзейнасці адвакатуры сведчыць аб узрастаючым попыце на юрыдычныя паслугі. Статус адваката быў радыкальна ўдасканалены ў XVII–XVIII стст. на падставе розных сацыяльна-эканамічных і палітычных прычынах. Усё большая ўвага звяртаецца на тое, каб адвакат быў адукаваным і высокамаральным. Гэты род заняткаў паступова пачаў лічыцца лепшым для маладых шляхцічаў не толькі як высакародная прафесія, але і як добры спосаб забяспечыць сябе матэрыяльна.

На аснове вывучэння крыніц разглядаемага часу аналізуецца тэрытарыяльнае геаграфічнае паходжанне адвакатаў. Абгрунтоўваецца, што

большасць юрыстаў прыйшло з беларускіх ваяводстваў ВКЛ, асабліва з гарадоў, дзе размяшчаліся судовыя ўстановы. Гэтыя дадзеныя маюць важнае значэнне, паколькі сведчаць, дзе ў асноўным канцэнтраваўся інтэлектуальны патэнцыял дзяржавы. Таксама адзначаецца, што пачынаючы з XVI ст. адвакатура перажывала значныя змены, якія патрабавалі высокай прафесійна-прававой падрыхтоўкі адвакатаў. Большасць адвакатаў атрымлівала адукацыю ў Віленскім універсітэце, а некаторыя з іх скончылі нават заходнееўрапейскія інстытуты. Аднак пры гэтым хоць юрысты пачалі актыўна атрымліваць вышэйшую адукацыю, яе ўзровень і тыя прадметы, якім вывучаліся, былі недастатковымі ў галіне юрыспрудэнцыі. Таму вельмі каштоўнымі былі веды, атрыманыя ад непасрэднага ўдзелу ў судовых пасяджэннях і ад зносін з прафесійнымі адвакатамі-практыкамі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

**1.** Інстытут адвакатуры і яго тэрміналагічнае вызначэнне складваліся паступова разам з гістарычным развіццём дзяржаўнасці, і, адпаведна, прававой сістэмы. Гістарычна ўстаноўлена, што менавіта формы арганізацыі рымскай адвакатуры, як рэспубліканскага перыяду, так і часоў Імперыі, паклалі пачатак узнікненню і развіццю інстытуту адвакатуры ў еўрапейскіх дзяржавах, у тым ліку і на Беларусі. Станаўленне адвакатуры, як прававога інстытуту, на Беларусі адбылося ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага, дзяржавы, палітыка-эканамічным цэнтрам якой былі беларускія землі. Аднак у гэты перыяд яшчэ не было сфарміравана аднастайнага тэрміналагічнага вызначэння судовага абаронцы і прававога дарадчыка, таму ў гістарычных судовых дакументах мы знаходзім розныя тэрміны, якія фактычна азначалі асоб, што займаліся абарончай дзейнасцю і аказвалі юрыдычныя паслугі на платнай аснове. На ўжыванне таго ці іншага тэрміну ўплывалі не толькі характэрныя асаблівасці беларускай мовы, але і тэндэнцыі ў развіцці юрыдычнай тэрміналогіі Заходняй Еўропы і ў тым ліку Польшчы. На падставе аналізу практычнай дзейнасці і абавязкаў такіх асоб і адпаведна тагачаснага тэрміналагічнага вызначэння ў пазначаны перыяд прапаноўваецца аўтарская пазіцыя адносна гістарычнай эвалюцыі паняцця “адвакат” з выяўленнем яго гісторыка-тэрміналагічных асаблівасцяў:

- пракуратар (ад лац. procurator – прафесійны юрыст, прадстаўнік, давераная асоба) – гэта адзін з найстаражытнейшых тэрмінаў, узнікненне якога было звязана, па-першае, з гістарычнай пераемнасцю тэрміналогіі рымскага

права і ўвядзеннем на тэрыторыі Беларусі на працягу XIV–XVI стст. Магдэбургскага права, і, па-другое, яго замацаваннем у трох Статутах Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст.;

- умацаваны – чыста беларуская назва, якая з канца XVI ст. актыўна ўжывалася ў судовых дакументах побач з тэрмінам пракуратар, і, перш за ўсё, азначала асабу, якая была ўпаўнаважана (умацавана) сваім давернікам на прадстаўленне інтарэсаў у судзе;
- пленіпантэнт (ад лац. pleni potens – паўнамоцны) – тэрмін, запазычаны з рымскга права праз Польшчу, які пачаў узгадвацца ў судовых дакументах побач з пракуратарам, пачынаючы з другой паловы XVII ст. і азначаў даверанаю асобу ў судзе, якая перш за ўсё прадстаўляла адзін з бакоў (істца ці адказчыка);
- патрон (ад лац. patronus — абаронца, заступнік) – пераемна ўспрымаецца з польскага заканадаўства на беларускіх землях Рэчы Паспалітай з канца XVII ст. і становіцца дамінуючым у XVIII ст.;
- паверааны (ад рым. mecenas) – вызначэнне, якое з'явілася з бытуючага ў народзе пазначэння чалавека, што валодае пазнаннямі ў сферы юрыспрудэнцыі, і якому давяралі вядзенне сваіх спраў “procurator mercenarius” (платны, прафесійны абаронца): пачало сустракацца ў канцы XVII ст.;
- палестрант – з'яўленне ў судовай тэрміналогіі вышэйазначанай назвы было звязана з утварэннем Палестры (адвакатуры), аб якой упершыню афіцыйна згадваецца ва ўступе да Канстытуцыі 1726 года і ў асноўным тэксце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1764 года. Неабходна адзначыць, што да ўжывання на заканадаўчым узроўні азначанага вышэй тэрміна, ён у XVI–XVII стст. ужо актыўна выкарыстоўваўся ў ВКЛ і абазначаў асоб, якія прафесійна займаліся працэсуальным прадстаўніцтвам;
- прысяжны страпчы, прыватны паверааны, адвакат – гэтыя тэрміны з'явіліся значна пазней у сувязі з расійскай судовай рэформай. Тэрмін адвакат (ад лац. advocatus ад advoco – заклікаю, запрашаю) пачынае сустракацца ў архіўных дакументах з XIX ст. і паступова выключае ўсе астатнія назвы.

Такім чынам абгрунтоўваецца, што паходжанне і замацаванне адзінага тэрміна “адвакат” адбывалася шляхам паступовага гістарычнага развіцця на тэрыторыі Беларусі розных формаў судовай абарончай дзейнасці, што знаходзіла адлюстраванне і ў найменнях прадстаўнікоў інтарэсаў асоб разглядаемага перыяду. На змяненне адзначаных вышэй паняццяў уплывалі розныя фактары, у тым ліку сацыяльна-эканамічнае і прававое развіццё дзяржавы, пераацэньванне грамадствам каштоўнасцяў і прыярытэтаў, удасканаленне і фармалізацыя судовага працэсу, пашырэнне міжнародных зносін і да т.п. Вызначана, што ўмовы на ўжыванне розных тэрмінаў, для

акрэслення функцыі абаронцы, пачынаючы з канца XVI ст., дыктавалі і адпаведныя тэндэнцыі ў Заходняй Еўропе і асабліва ў Польшчы. Адсюль і пэўнае запазычанне тэрміналогіі. На наш погляд, захаваныя ў сучасным заканадаўстве паняцці “адвакатура” і “адвакат” з’яўляюцца лепшым адлюстраваннем гістарычнай эвалюцыі наймення людзей, якія аказвалі юрыдычную дапамогу, аб’яднаўшыся ў прафесійную калегію. Менавіта гэтыя паняцці пазней увабралі ў сябе прафесійную сілу і незалежнасць адвакатуры, атрыманыя ў працэсе барацьбы за яе самастойнае існаванне як неабходнага грамадскага і прававога інстытуту абароны правоў і інтарэсаў асобы [2; 3; 9].

**2.** Перадумовай узнікнення інстытуту адвакатуры была аб’ектыўная неабходнасць абароны ў грамадскіх спрэчках, а потым і ў судзе, інтарэсаў асоб, якія не валодалі неабходнымі пазнаннямі ў галіне юрыспрудэнцыі, а таксама, не мелі магчымасці з якой-небудзь прычыны самастойна выступаць з прамовамі на судзе. Разам з гэтым устаноўлена, што ўзнікненню і развіццю адвакатуры папярэднічалі яе асобныя формы:

а) прадстаўніцтва:

- натуральнае прадстаўніцтва: яго сутнасць заключалася ў тым, што найбольш блізкія для чалавека асобы (родзічы, сябры, сельская грамада) у працэсе прававой спрэчкі дапамагалі яму парадамі, або, калі бок па справе не меў магчымасці з якой-небудзь прычыны самастойна трымаць прамову на судзе, то і выступаць ад яго імя. Апошняе датычылася ў першую чаргу непаўналетніх асоб, жанчын, а таксама асоб, якія пакутавалі на розныя захворванні, не дазваляўшыя ім самастойна адстойваць свае правы, напрыклад, псіхічныя захворванні, немата, агульная слабасць і да т.п. Адметная рыса такой судовай замены была ў тым, што адна асоба (прадстаўнік) дзейнічала ў судовым працэсе замест другой асобы (прадстаўляемага) такім чынам, што наступствы яго дзейнасці адлюстроўваліся на той прадстаўляемай асобе, справу якой вёў прадстаўнік, а судовае рашэнне выносілася і прыводзілася ў дзеянне на карысць або супраць той асобы, якую ён замяніў на судзе;

- прафесійнае (наёмнае) прадстаўніцтва: на наш погляд, на тэрыторыі Беларусі прафесійнае (наёмнае) прадстаўніцтва, якое з’яўляецца першай гістарычнай састаўляючай адвакацкай дзейнасці і крытэрыямі якога былі платнасць паслуг і іх аказанне розным асобам (а не толькі родзічам, як у натуральным прадстаўніцтве), вядома яшчэ ў дастатутны перыяд і звязана з пачатковым перыядам дзейнасці Вялікага Княства Літоўскага, дзе функцыі прадстаўнікоў паступова пераходзяць ад натуральных прадстаўнікоў да наёмных – дзякоў, пісараў, служэбнікаў, а таксама шляхціцаў.

б) правазаступніцтва: станаўленне яго пачалося ў XIV стагоддзі ў сувязі з рэцэпцыяй найбольш развітымі і буйнымі беларускімі гарадамі Магдэбургскага

права. Пад правазаступніцтвам разумеецца якасна новы ўзровень прафесійнага аказання адвакацкіх паслуг, найбольш блізкі да сучаснага паняцця адвакатуры, які характарызуецца з'яўленнем асобага кола прававедаў – знаўцаў, якія не толькі прадстаўлялі свайго кліента шляхам давядзення да ведама суда яго пазіцыі, але і непасрэдна ўплывалі на зыход справы шляхам уласнага трактавання матэрыялаў справы, доказаў, калізій заканадаўства і правапрымяняльнай практыкі. На наш погляд, правазаступніцтва ёсць найбольш падобная да сучаснага вызначэння адвакатуры форма юрыдычнай дзейнасці. Яго ўзнікненне і развіццё было выклікана паступовым пераўтварэннем судовага прадстаўніцтва ў прафесію і ўскладненнем юрыдычных норм, што было абумоўлена наступнымі прычынамі:

- палітычнымі: 1) кансалідацыя зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага, у працэсе якой адбывалася пераадоленне феадальнай раздробленасці і паступовая ўніфікацыя заканадаўства; 2) цэнтралізацыя вялікакняжацкай улады, што спрыяла складванню аднастайнасці мясцовага дзяржаўнага апарату, зараджэнню бюракратыі і ўзнікненню новых дзяржаўных інстытутаў, у тым ліку і судовых;

- сацыяльнымі: 1) узнікненне пісанага заканадаўства, наступствам чаго стала большая інфармаванасць аб ім насельніцтва; 2) паступовая замена норм звычаёвага права палажэннямі пісанага закона, які ўсё больш ускладняўся і станавіўся неаднолькавым адносна розных катэгорый насельніцтва; 3) адным з вынікаў фарміравання саслоўя шляхты стала і неабходнасць абароны яе палітычных і эканамічных правоў; 4) прыход замест малаадукаваных прадстаўнікоў раннефеадальнай эпохі прафесійных прадстаўнікоў, якія ў абавязковым парадку валодалі граматай, патрэбнай для таго, каб чытаць законы, складаць позвы, скаргі, весці запісы ў судовых кнігах. Апошняе было асабліва неабходным, улічваючы паступовую бюракратызацыю судовага працэсу, які з цягам часу настолькі фармалізаваўся і ўскладніўся, што без спецыяльных прававых ведаў і валодання граматай нельга было выступаць у ім у якасці прадстаўнікоў;

- эканамічнымі: 1) пераход ад натуральнай гаспадаркі да грашовай. Так, да XIVст. на тэрыторыі Беларусі ў эканамічным жыцці панавала натуральная гаспадарка з шырокім ужываннем норм звычая. Гандаль засяроджваўся ў параўнальна вузкіх рамках мясцовага рынку, паколькі гаспадарка была накіравана на ўласнае спажыванне, а не на шырокі збыт. Між тым, напрыканцы XV ст. ужо былі відавочны асобныя рысы працэса заняпаду натуральнай гаспадаркі і замены яе грашовай. Усё больш інтэнсіўна развіваўся гандаль, з'яўляліся новыя рынкі збыту і новыя гандлёвыя цэнтры, а з пашырэннем Магдэбургскага права ў многіх гарадах адбываліся штогадовыя (і некалькі

разоў на год) кірмашы і інш. Раней за ўсё гэтыя працэсы на тэрыторыі Беларусі выявіліся на Полацкай і Віцебскай землях. Паступова вызначаецца пераход ад натуральных падаткаў і дзяржаўных павіннасцей да грашовых плацяжоў. Такім чынам, грашовая гаспадарка, якая спрыяла развіццю новых галін вытворчасці і спецыялізацыі ў працы, пачынае не адпавядаць кансерватыўнаму і мала гнуткаму звычаёваму праву. Узнікае патрэба ў дакладных, зафіксаваных у законе пісаных нормах, якія вызначалі б як шляхі рэалізацыі іх правоў, так і абароны яго ў судзе, у тым ліку з дапамогай прадстаўнікоў, свядомых у юрыдычных спрэчках; 2) у сувязі з паступовым павелічэннем тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага (розныя старажытныя землі і княствы аб’ядноўваліся ў адзіную дзяржаву, у выніку чаго адбывалася яднанне іх эканомік, пашырэнне гандлю і інш.). У такіх абставінах, калі, напрыклад, тыя купцы, якія валодалі маёмасцю ў некалькіх гарадах ВКЛ і вялі гандаль у розных яго землях, фізічна не маглі ўдзельнічаць у гаспадарчых спрэчках адначасова ва ўсіх гэтых месцах, таму і ўзнікала неабходнасць у павераных. Прычым, як сведчыць дакументальны матэрыял, дазвалялася мець адразу некалькі павераных, што вызваляла купцоў ад неабходнасці самастойнага ўдзелу ў судовым працэсе, эканоміла іх час і рэсурсы. Тым больш, што не кожная асоба мела здольнасць выступаць у судзе, асабліва пры паступовым, усё большым ускладненні судаводства [2; 3; 12; 15].

**3.** Адвакаты, як асобы, якія былі свядомыя ў праве і таму маглі ў пэўнай ступені абараняць перад дзяржаўнымі органамі і судом маючыя месца на той час правы свабоднага насельніцтва, існавалі на Беларусі да ўзнікнення Вялікага Княства Літоўскага. Аб гэтым сведчыць перш за ўсё дзейнасць копных судоў, дзе кожны свабодны чалавек мог выступіць у якасці абаронцы. Таксама ўжо амаль на стадыі ўзнікнення ВКЛ адвакаты дзейнічалі ў судах у тых гарадах, у якіх было ўведзена Магдэбургскае права. Між тым, фактарам, які перашкаджаў развіццю дзейнасці адваката, з’яўлялася тое, што належнага арганізацыйнага і заканадаўчага афармлення адвакатуры да XVI ст. зроблена не было. Гэты недахоп быў выпраўлены толькі пад час распрацоўкі Статутаў Вялікага Княтсва Літоўскага (1529, 1566, 1588 гг.), якія ўлічылі не толькі папярэдні прававы вопыт і старажытнае звычаёвае права беларускіх зямель, прававыя нормы, рэгулюючыя асобныя найбольш важныя пытанні дзейнасці адвакатаў, але і судова-адміністрацыйную практыку.

У той жа час, паралельна з тэндэнцыяй актывізацыі фарміравання інстытуту адвакатуры, мелі месца і фактары стрымлівання яго развіцця, найбольш значны з якіх – прынцып асабістай яўкі ў суд, адносна якога Статут 1529 г. не выказаў адназначных адносін. Гістарычныя крыніцы падаюць звесткі аб тым, што ў гэты перыяд адвакатура была яшчэ недасканалай і знаходзілася

на стадыі фарміравання, аб чым сведчыць наяўнасць толькі аднаго артыкула ў Статуце 1529 г. аб дзейнасці адвакатуры. Менавіта недастатковасць рэгулявання адвакацкай дзенасці спараджала злоўжыванні з боку адвакатаў, што выклікала шматлікія скаргі шляхты князю і падачы іх на сойм. Менавіта гэта і з’явілася галоўным штуршком для далейшай нарматыўнай распрацоўкі статуса адвакатаў, а потым і замацавання адпаведных артыкулаў адносна дзейнасці пракуратараў у Статутах ВКЛ 1566 і 1588 гг. Паралельна з гэтым усё большая актывізацыя таварна-грашовых адносін у XVI ст. стала прычынай пашырэння попыту на адвакацкія паслугі і лагічна прывяло да ўзрастання колькасці адвакатаў, і як вынік – паглыбленне прафесіяналізму адвакатаў і пашырынне прававых ведаў сярод насельніцтва [1; 3; 6; 7; 8; 10; 11; 13; 14; 16; 18].

**4.** На падставе аналізу дакументальна-прававога матэрыялу ўстаноўлена, што працэс фарміравання інстытуту адвакатуры на беларускіх землях актывізаваўся ў другой палове XVI ст., аб чым сведчаць перш за ўсё Статуты 1529, 1566, 1588 гг., аднак ён не быў завершаны і прадоўжыўся ў XVII–XVIII стст. у складзе Рэчы Паспалітай, прычым з улікам значнага ўплыву польскіх адвакацкіх традыцый і новых агульнаеўрапейскіх прававых тэндэнцый:

а) асацыяцыі адвакатаў, якія былі ўтвораны ў ВКЛ і заканадаўча замацаваны яшчэ ў XVI ст., не мелі адзінага вызначэння, павольна трансфарміраваліся ў больш развітую, у параўнанні з папярэднім перыядам, прафесійную супольнасць, у пэўнай ступені запазычаную з польскага права, пад назвай Палестра. Яна вызначалася канцэптуальна новым узроўнем і характарам дзейнасці. Перш за ўсё гэта праявілася ў самой назве. Тэрмін “Палестра” – быў новы тэрмін, які замацоўваў уласную назву для ўсяго інстытуту адвакатуры і з’яўляўся сінонімам сучаснага паняцця “адвакатура”. Навізна была і ў сутнасці Палестры, бо гэты тэрмін на заканадаўчым узроўні замацаваў супольнасць адвакатаў у сукупнасці. Вядомы па тагачасным архіўных крыніцах тэрмін “пракуратар” абазначаў, па сутнасці, толькі аднаго адваката, а не іх прафесійнае аб’яднанне, што сведчыць аб значных змяненнях адносін заканадаўцы і гэтага інстытуту і самой яго сутнасці ў XVI–XVIII стст.;

б) у XVII–XVIII стст. праявілася пэўная тэндэнцыя да элітарызацыі як непасрэдна Палестры, так і адвакацкай працы ўвогуле, што ў сваю чаргу прывяло да ўзнікнення інтарэсу з боку найбольш здатных і таленавітых асоб;

в) нягледзячы на тое, што судовая сістэма ВКЛ, а таксама судовы працэс і ўзаемаадносіны ўдзельнікаў у ім, былі значна набліжаны да польскіх, усё ж заставалася ў кантэксце адасобленасці ВКЛ тэндэнцыя да захавання ўласных прававых і карпаратыўных ліцьвінскіх традыцый, у тым ліку і ў сферы адвакатуры. Гэта тлумачыцца тым, што на беларускіх землях працягвалі сваё

існаванне папярэднія традыцыі, а таксама былі сфарміраваны ўласныя, досыць дасканалыя заканадаўчыя нормы (перш за ўсё нормы Статутаў), якія рэгулявалі дзейнасць адвакатаў. Аналіз дакументальна-прававога матэрыялу гэтага перыяду сведчыць, што калі ў заканадаўстве ВКЛ мелася ўласнае палажэнне, то юрысты ВКЛ аддавалі перавагу захаванню і ўжыванню ўласных юрыдычных набыткаў. На іх, у першую чаргу, і абапіраліся айчынныя пракуратары, і толькі ў выпадку адсутнасці ў заканадаўстве і практыцы ВКЛ пэўнага палажэння, яны маглі запазычвацца з Польшчы;

г) у азначаны час назіраюцца ўсё больш узрастаючыя патрабаванні да адвакатаў. Так, нарматыўна рэгламентуецца, што адвакатамі не маглі быць людзі нізкіх саслоўяў, амбасадары, суддзі, службоўцы судоў, ваенныя, падсудныя ці асуджаныя па крымінальных справах. Як сведчыць дакументальна-прававы матэрыял, агульнаадукацыйны і прафесійны ўзровень адвакатаў значна ўзрос у параўнанні з папярэднім перыядам. Выяўлена цікавая тэндэнцыя адносна таго, што хоць юрысты яшчэ з XVI ст. пачалі актыўна атрымліваць вышэйшую адукацыю, яе ўзровень і тыя прадметы, якія вывучаліся, былі недастатковымі ў галіне юрыспрудэнцыі, таму каштоўнасць набылі веды, атрыманыя ад непасрэднага ўдзелу ў судовых пасяджэннях і ад зносін з прафесійнымі адвакатамі-практыкамі, а таксама з мемуараў і запісаў юрыстаў. Таксама адзначана тэндэнцыя павелічэння колькасці падстаў, якія цягнулі за сабой страту адвакатам працы. У прыватнасці, было прадугледжана дванаццаць такіх выпадкаў (яўка ў суд у нецвярозым стане, атрыманнем хабараў і да т.п.). Новаўвядзеннем стала і правіла, згодна з якім праз пэўны прамежак часу суддзі павінны былі ацэньваць дзейнасць адвакатаў і выстаўляць ім пэўныя адзнакі, што запісвалася ў спецыяльныя кнігі [4; 5; 7; 13; 17].

**5.** Тэрытарыяльна-геаграфічнае паходжанне адвакатаў ахоплівала практычна ўсю тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага. Пры гэтым большасць юрыстаў паходзіла з тых паветаў ВКЛ, дзе размяшчаўся сам суд і, неабходна падкрэсліць, што гэта ў асноўным былі беларускія землі. Аднак у сувязі з больш цеснымі адносінамі з Польшчай маюцца таксама дадзеныя пра наяўнасць у XVII–XVIII стст. у Галоўным судзе (Трыбунале) ВКЛ нешматлікіх выхадцаў з Польшчы. Гэта сведчыць аб тым, што адвакаты-ліцьвіны паспяхова канкурыравалі з польскімі адвакатамі, не пускаючы апошніх на рынак юрыдычных паслуг. У адпаведнасці з архіўнымі дадзенымі асноўная маса адвакатаў паходзіла з Беларусі, асабліва з Ашмянскага, Лідскага і Гарадзенскага паветаў, што сведчыць аб вялікай канцэнтрацыі ў той час інтэлектуальнага патэнцыялу на беларускіх тэрыторыях, а таксама, галоўным чынам, дэманструе дыялектычную залежнасць інтэнсіўнасці развіцця

інстытута адвакатуры ад агульнага сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця грамадства [5].

**6.** На падставе выяўленых тэндэнцый і заканамернасцей станаўлення і развіцця адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст. устаноўлена гістарычная абумоўленасць сутнасці сучаснай айчыннай адвакатуры і пераемнасці асноўных прынцыпаў адвакацкай дзейнасці, закладзеных з улікам дзяржаўна-прававой традыцыі беларускага народа яшчэ ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. У гэтай сувязі ўяўляецца, што асэнсаванне гістарычнага вопыту станаўлення і развіцця інстытуту адвакатуры, як самастойнага прававога інстытуту, у XVI–XVIII ст. на беларускіх землях будзе вельмі карысным у працэсе далейшага ўдасканалення нацыянальнай прававой сістэмы. Так, з аналізу нормаў Статутаў і архіўных дакументаў, якія ўпершыню на заканадаўчым узроўні прадугледжвалі не толькі правы і абавязкі, але і адказнасць адвакатаў за недобрасумленнае выкананне сваіх абавязкаў у выглядзе турэмнага зняволення на чатыры тыдні, а таксама выплаты боку за недобрасумленную працу матэрыяльнай шкоды, аўтарам прапаноўваецца пераняць, з улікам сучасных тэндэнцый і патрабаванняў, матэрыяльную меру адказнасці адвакатаў і замацаваць яе на заканадаўчым узроўні.

Таксама адпаведна таму, што ўжо ў другой палове XVIII ст. было ўведзена правіла, згодна з якім праз пэўны прамежак часу суддзі павінны былі даваць ацэнку дзейнасці адвакатаў, якія запісваліся ў спецыяльныя кнігі, і, якія, у наступным, мелі важкае значэнне пры вырашэнні пытання аб прафесійнай прыдатнасці адваката, на наш погяд, прадстаўляецца мэтазгодным пераняць, з улікам сучасных падыходаў, вышэйазначаную практыку. Уяўляецца, што азначаная вышэй практыка можа паспрыяць павышэнню прававых ведаў адвакатаў і якасці падрыхтоўкі апошніх да судовых працэсаў, а таксама прымяняцца для ацэнкі дзейнасці адвакатаў (якасці іх тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі), якая ў наступным можа стаць вызначальнай пры іх пераатэстацыі [1; 4; 15; 17].

## Рэкамендацыі па практычнаму выкарыстанню вынікаў

Палажэнні і вывады дысертацыі могуць быць карыснымі: а) у працэсе далейшых навуковых распрацовак айчыннай гісторыі дзяржавы і права, у тым ліку адносна пытанняў, прысвечаных гісторыі адвакатуры наступных гістарычных перыядаў; б) пры ўдакладненні курса лекцый і напісанні абагульняючых прац па гісторыі дзяржавы і права Беларусі і асобнага навучальнага дапаможніка па гісторыі адвакатуры Беларусі; в) пры распрацоўцы матэрыялаў выхаваўча-ідэалагічнага характару, павышэнні

прававой і агульнай культуры адвакатаў Беларусі на падставе гістарычнай пераемнасці нацыянальных прававых набыткаў (Даведка Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве ад 30.11.2015 , Ліст Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 02.12.2015), а таксама пры далейшых даследаваннях пытанняў гісторыі адвакатуры, у прававым выхаванні грамадзян, а такама ў мэтах павышэння прававой культуры адвакатаў Рэспублікі Беларусь (Акт Рэспубліканскай калегіі адвакатаў ад 28.04.2015).

## СПІС РАБОТ, АПУБЛІКАВАНЫХ АЎТАРАМ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы ў навуковых выданнях, уключаных ВАК у пералік выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў**

1. Гур'ева, А. А. Развіццё адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі і ўвядзення ў дзеянне Статутаў ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. / А. А. Гур'ева // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2012. – № 2. – С. 87–90.
2. Гур'ева, А. А. Формы адвакацкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў XVI стагоддзі / А. А. Гур'ева // Право.by. – 2012. – № 6. – С. 15–18.
3. Гур'ева, А. А. Утварэнне і развіццё адвакатуры на тэрыторыі Беларусі да прыняцця Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 года / А. А. Гур'ева // Весн. Беларус. дзярж. экан. ун-та. – 2013. – № 2. – С. 77–82.
4. Гур'ева, А. Развіццё адвакатуры ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай / А. Гур'ева // Юстыцыя Беларусі. – 2013. – № 5. – С. 65–67.
5. Гур'ева, А. А. Прафесійны ўзровень адвакатаў у XVII–XVIII стст. / А. А. Гур'ева // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2016. – № 1. – С. 79–83.

**Матэрыялы канферэнцый і тэзісы выступленняў**

6. Пенязь, А. А. (Гур'ева, А. А.) Гісторыка-прававая навука ў працах І. А. Юхо / А. А. Пенязь (А. А. Гур'ева) // Актуальные проблемы правоведения: история и современность : материалы междунар. науч. конф. студентов и аспирантов, посвящ. 80-летию юрид. фак. Белорус. гос. ун-та, Минск, 18–19 окт. 2005 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Г. А. Шумак (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2006. – С. 7–8.
7. Пенязь, А. А. (Гур'ева, А. А.) Развіцце інстытута адвакатуры ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI стагоддзі / А. А. Пенязь (А. А. Гур'ева) // Право Беларуси: история и современность : сб. материалов Междунар. науч.-теорет. конф. студентов, магистрантов и аспирантов «Развитие институтов гражданского права в законодательстве Беларуси от Статуса ВКЛ 1529 г. до Гражданского кодекса Республики Беларусь 1998 г.», Минск, 24 нояб. 2009 г. ; Респ. науч.-теорет. конф. студентов, магистрантов и аспирантов «Декларация о государственном суверенитете Белорусской ССР от 27 июля 1990 г. и ее место в развитии конституционного процесса в Республике Беларусь», Минск, 16 нояб. 2010 г. / Белорус. гос. экон. ун-т ; редкол.: И. В. Вишневская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2010. – С. 45–46.

8. Пенязь, Е. А. (Гурьева, Е. А.) Конституционные основы института адвокатуры по статутам Великого княжества Литовского XVI в. / Е. А. Пенязь (Е. А. Гурьева) // Право Беларуси: история и современность : сб. материалов Междунар. науч.-теорет. конф. студентов, магистрантов и аспирантов «Развитие институтов гражданского права в законодательстве Беларуси от Статуса ВКЛ 1529 г. до Гражданского кодекса Республики Беларусь 1998 г.», Минск, 24 нояб. 2009 г. ; Респ. науч.-теорет. конф. студентов, магистрантов и аспирантов «Декларация о государственном суверенитете Белорусской ССР от 27 июля 1990 г. и ее место в развитии конституционного процесса в Республике Беларусь», Минск, 16 нояб. 2010 г. / Белорус. гос. экон. ун-т ; редкол.: И. В. Вишневская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2010. – С. 184–186.

9. Пенязь, Е. А. (Гурьева, Е. А.) Положения об адвокатуре СССР 1939 года и его значение / Е. А. Пенязь (Е. А. Гурьева) // Конституции Республики Казахстан – 15 лет : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10 сент. 2010 г. / Посольство Респ. Казахстан в Респ. Беларусь. – Минск, 2010. – С. 48–49.

10. Пенязь, А. А. (Гур'ева, А. А.) Роля адвакатаў і іх функцыі пры вядзеніі спраў у судах / А. А. Пенязь (А. А. Гур'ева) // Правовое обеспечение инновационного развития общества и государства : материалы междунар. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Минск, 29–30 окт. 2010 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Г. А. Шумак (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 5–6.

11. Пенязь, Е. А. (Гурьева, Е. А.) Оформление института адвокатуры в XVI столетии (по статутам Великого княжества Литовского) / Е. А. Пенязь (Е. А. Гурьева) // Актуальні проблеми юридичної науки : зб. тез. міжнар. наук. конф. «Дев'яті осінні юридичні читання», Хмельницький, 12–13 листоп. 2010 р. : у 4 ч. / Хмельниц. ун-т упр. та права. – Хмельницький, 2010. – Ч. 1 : Теорія держави і права. Історія політичних та правових вчень. Філософія права. Міжнародне право. Порівняльне правознавство. – С. 80–82.

12. Пенязь, А. А. (Гур'ева, А. А.) Прадстаўнікі духавенства і шляхта як прафесійныя абаронцы ў Вялікім княстве Літоўскім / А. А. Пенязь (А. А. Гур'ева) // Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння І. А. Юхо, Мінск, 18–19 сак. 2011 г. / Юрыд. фак. Беларус. дзярж. ун-та, Юрыд. каледж Беларус. дзярж. ун-та ; рэдкал.: С. А. Балашэнка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – С. 172–174.

13. Пенязь, Е. А. (Гурьева, Е. А.) Статут Великого княжества Литовского 1588 года – законодательная основа оформления института адвокатуры / Е. А. Пенязь (Е. А. Гурьева) // X Международная студенческо-аспирантская научная

конференция «Актуальные проблемы прав человека, государства и правовой системы», Львов, 6–8 мая 2011 г. / Львов. нац. ун-т. – Львов, 2011. – С. 53–54.

14. Пенязь, А. А. (Гур’ева, А. А.) Замацаванне інстытута адвакатуры ў прававой сістэме Беларусі ў XVI ст. / А. А Пенязь (А. А. Гур’ева) // Концептуальные основы развития национальных правовых систем в контексте процессов глобализации и региональной интеграции: постсоветский опыт и перспективы устойчивого развития : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 7–8 окт. 2011 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: С. А. Балашенко (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 180–181.

15. Пенязь, А. А. (Гур’ева, А. А.) Роля адвакатаў ў судовым жыцці Вялікага Княства Літоўскага ў XVI стагоддзі / А. А. Пенязь (А. А. Гур’ева) // Судебная власть на Беларуси: история, современность, перспективы развития (к 430-летию образованеия главного суда ВКЛ – Литовского Трибунала) : матэрыялы міжнар. студен. конф., Минск, 16–17 нояб. 2011 г. / Белорус. гос. экон. ун-т ; редкол.: И. В. Вишневская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2011. – С. 118–119.

16. Гур’ева, А. А. Нарматыўнае рэгуляванне і дзейнасць адвакатуры на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. / А. А. Гур’ева // Сборник работ 69-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, 14–17 мая 2012 г., Минск : в 3 ч. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2013. – Ч. 2. – С. 315–319.

17. Гур’ева, А. А. Развіццё адвакатуры ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай / А. А. Гур’ева // Юридическая наука и правоприменительная практика : материалы междунар. науч. конф. студентов, магистрантов и аспирантов, Минск, 26–27 окт. 2012 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: О. И. Чуприс (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 6–7.

18. Гур’ева А. А. Нарматыўная рэгламентацыя адвакацкай дзейнасці ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1566 года / А. А. Гур’ева // Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1566 г.: да 450-годдзя выдання : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. круглага стала, Мінск, 1 крас. 2016 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Т. І. Доўнар (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 208–214.

## РЭЗЮМЭ

Гур'ева Алена Аляксандраўна

**Гісторыя інстытута адвакатуры Беларусі (XVI–XVIII стст.)**

**Ключавыя словы:** формы адвакацкай дзейнасці, прадстаўніцтва, правазаступніцтва, пракуратар, Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая, адвакат, адвакатура, адукацыя, Статуты.

**Мэта даследавання:** выяўленне прычын і заканамернасцей узнікнення, станаўлення і развіцця інстытута адвакатуры на Беларусі, а таксама ліквідацыя прабелу ў гісторыка-прававой навуцы адносна функцыянавання адвакатуры XVI–XVIII стст.

**Метады даследавання:** агульнанавуковыя (параўнальны аналіз, сінтэз, індукцыя, дэдукцыя), спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны), спецыяльна-прававыя (параўнальна-прававы, сістэмна-прававы, тлумачэння прававых нормаў) метады.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** упершыню ў гістарычна-прававой навуцы Беларусі праведзена комплекснае даследаванне прычын, перадумоў, сутнасці станаўлення і развіцця адвакатуры на Беларусі ў XVI–XVIII стст. Прааналізаваны прычыны і ўмовы гістарычнага з'яўлення судовай абарончай дзейнасці ў кантэксце яе сутнасці і асаблівасцей тэрміналагічнага вызначэння, выяўлены прычыны, гістарычныя і арганізацыйна-прававыя ўмовы станаўлення інстытута адвакатуры на Беларусі ў XVI ст., вызначаны прававы статус прадстаўніка і правазаступніка, выяўлены асаблівасці і тэндэнцыі ў нарматыўнай рэгламентацыі інстытута адвакатуры і правапрымяняльнай дзейнасці ў XVI–XVIII стст. перыяду Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай; на падставе прынцыпу гістарычнай пераемнасці паказана неабходнасць успрымання асноўных прынцыпаў і метадаў адвакацкай дзейнасці XVI–XVIII стст. на наступных гістарычных этапах з мэтай ўдасканалення сучаснай адвакатуры.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні:** палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны ў працэсе далейшых навуковых распрацовак айчыннай гісторыі дзяржавы і права, у тым ліку адносна пытанняў, прысвечаных гісторыі адвакатуры наступных гістарычных перыядаў, пры падрыхтоўцы падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для вышэйшых і сярэдне-спецыяльных навучальных устаноў, у сферы ідэалагічна-выхаваўчай працы сярод студэнтаў, а такама павышэння прававой культуры адвакатаў Рэспублікі Беларусь.

**Галіна прымянення:** навукова-даследчая, нарматворчая дзейнасць, правапрымяняльная практыка, навучальны працэс.

# РЕЗЮМЕ

Гурьева Елена Александровна

**История института адвокатуры Беларуси (XVI–XVIII вв.)**

**Ключевые слова:** формы адвокатской деятельности, представительство, правозаступничество, прокуратор, Великое Княжество Литовское, Речь Посполитая, адвокат, адвокатура, образование, Статуты.

**Цель исследования:** выявление причин и закономерностей возникновения, становления и развития института адвокатуры на Беларуси, а также ликвидация пробела в историко-правовой науке относительно деятельности адвокатуры XVI–XVIII вв.

**Методы исследования:** общенаучные (сравнительный анализ, синтез, индукция, дедукция), специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный), специально-правовые (сравнительно-правовой, системно-правовой, толкование правовых норм) методы.

**Полученные результаты и их новизна:** впервые в историко-правовой науке Беларуси проведено комплексное исследование причин, предпосылок, условий становления и развития адвокатуры на Беларуси в XVI–XVIII вв. Проанализированы причины и условия исторического появления судебной оборонческой деятельности в контексте ее сути и особенностей терминологиче ского определения, выявлены причины, исторические и организационно-правовые условия становления института адвокатуры на Беларуси в XVI ст., определен правовой статус представителя и правозаступника, выявлены особенности и тенденции в нормативной регламентации института адвокатуры и правоприменительной деятельности в XVI–XVIII вв. периода Великого Княжества Литовского и Речи Посполитой; на основе принципа исторической преемственности показана необходимость восприятия основных принципов и методов адвокатской деятельности XVI–XVIII вв. на следующих исторических этапах с целью совершенствования современной адвокатуры.

**Рекомендации по использованию:** положения диссертации могут быть использованы в процессе дальнейших научных разработок отечественной истории государства и права, в том числе относительно вопросов, посвященных истории адвокатуры следующих исторических периодов, при подготовке учебников и учебных пособий для высших и средне-специальных учебных заведений, в сфере идеологическо-воспитательной работы среди студентов, а также повышения правовой культуры адвокатов Республики Беларусь.

**Область применения:** учено-исследовательская, нормотворческая деятельность, правоприменительная практика, учебный процесс.

## SUMMARY

Alena A. Huryeva

**History of the institute of advocacy in Belarus (XVI–XVIII centuries.)**

**Key words:** forms of advocacy, agency, rights defender, procurator, the Grand Duchy of Lithuania, Rzeczpospolita, lawyer, advocacy, education, Statutes.

**Research objectives:** identification causes and patterns of occurrence, formation and development of the legal profession in Belarus, as well as the elimination of the gap in the historical and legal science on the functioning of the legal profession XVI–XVIII centuries.

**Methods of research:** general scientific (comparison, analysis, synthesis, induction, deduction), specially-historical (historical-genetic, historical and comparative), specially-legal (comparative-legal, systematic-legal, interpretation of legal norms) methods.

**The results and their novelty:** for the first time in the historical and legal science in Belarus it has been conducted a comprehensive research of the reasons, prerequisites, conditions of formation and development of the advocacy in Belarus in the XVI–XVIII centuries. Reasons and conditions of judicial defense historical appearance were analyzed in the context of its nature and terminological definition characteristics; the legal profession causes, historical, organizational and legal conditions in Belarus in the XVI century were defined; the legal status of a representative and rights defender was defined; normative regulation peculiarities and trends were revealed for the advocacy bar and law-enforcement activities in the XVI–XVIII centuries during the period of the Grand Duchy of Lithuania and the Rzeczpospolita; the necessity of perception for fundamental principles and methods of advocacy in the XVI–XVIII centuries and the following historical stages is shown based on historical continuity principle with the aim to improve modern legal profession.

**Recommendations for the extent use:** the dissertation provisions may be used in further scientific research in the sphere of country's history of state and law, including the issues dedicated to the history of legal profession of the following historical periods, preparation of textbooks and manuals for higher and secondary specialized educational institutions in the field of ideological and educational work among the students, as well as improving the legal culture of the Republic of Belarus advocates.

**Application spheres:** research, law making, law enforcement, educational process.